УДК 81376:811.161.3

# РАЗВІЦЦЁ КАМУНІКАТЫЎНАЙ КАМПЕТЭНТНАСЦІ НАВУЧЭНЦАЎ ПРЫ РАБОЦЕ З ПРАФЕСІЙНА АРЫЕНТАВАНЫМІ ТЭКСТАМІ

*Шубадзёрава Ала Міхайлаўна*
дацэнт кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін установы адукацыі "Магілёўскі інстытут Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь", кандыдат філалагічных навук, дацэнт
(г. Магілёў, Рэспубліка Беларусь)

*У артыкуле разглядаюцца асаблівасці арганізацыі работы з прафесійна арыентаванымі тэкстамі ў працэсе навучання юрыдычнай лексіцы. Апісваецца сістэма заданняў, якая дазваляе сфарміраваць камунікатыўныя навыкі і ўменні, выяўляюцца ўмовы найбольш эфектыўнага і якаснага засваення юрыдычнай тэрміналогіі падчас работы з прафесійнымі тэкстамі.*

Неабходнай умовай падрыхтоўкі будучых спецыялістаў, здольных паспяхова прымяняць тэарэтычныя веды на практыцы ў разнастайных прафесійных сітуацыях, выкарыстоўваць набытыя навыкі для рашэння розных маўленчых задач, з'яўляецца мэтанакіраванае фарміраванне камунікатыўнай кампетэнцыі.

Для выпрацоўкі ў навучэнцаў уменняў правільнага ўспрымання і аднаўлення навуковай інфармацыі па спецыяльнасці вялікую ролю адыгрываюць вучэбныя прафесійна арыентаваныя тэксты. Як падкрэслівае Г.А. Золатава, «лінгвістыка ўсё больш упэўнена рухаецца да таго, каб лічыць тэкст сваім асноўным аб'ектам. Мова існуе для зносін, а абмен інфармацыяй адбываецца менавіта ў тэкстах… Усе катэгорыі і кампаненты мовы як часткі адзінага цэлага прызначаны для таго, каб служыць тэксту» [1, с. 108].

У тэкстах моўны матэрыял паўстае ў яго натуральным функцыянаванні, адбываецца сінхроннае ўзаемадзеянне ўсіх узроўняў моўнай сістэмы. Тэкст заўсёды адлюстроўвае пэўныя ментальныя характарыстыкі носьбітаў дадзенай мовы, што важна пры фарміраванні камунікатыўнай кампетэнцыі навучэнцаў.

Пры навучанні прафесійнай лексіцы эфектыўным з'яўляецца такі метадычны падыход, калі тэкст выступае і адзінкай, і сродкам, і мэтай навучання. Як адзначаюць многія даследчыкі, у такім выпадку тэкст становіцца: 1) сродкам пазнання мовы як поліфункцыянальнай з'явы; 2) найважнейшым сродкам далучэння да нацыянальнай культуры; 3) адзінкай мовы, на аснове якой адбываецца пазнанне граматычных катэгорый, моўных з'яў, фарміруецца сістэма лінгвістычных паняццяў; 4) маўленчым творам, вынікам выкарыстання сістэмы мовы, на аснове якога ажыццяўляецца вывучэнне мовы ў дзеянні, засвойваюцца заканамернасці функцыянавання мовы ў маўленні; 5) асноўным сродкам авалодання вуснымі і пісьмовымі формамі маўлення, авалодання маўленчай дзейнасцю ва ўсіх яе відах (чытанне, разуменне, гаварэнне, пісьмо); 6) сродкам стварэння сітуацый, на аснове якіх ажыццяўляюцца рэальныя зносіны. Менавіта на аснове тэксту аказваецца магчымым неабходны сінтэз, спалучэнне двух асноўных важных напрамкаў у вывучэнні мовы: пазнанне сістэмы мовы і авалоданне нормамі маўленчых паводзін у розных сітуацыях [2, с. 35].

Падбор тэкстаў з'яўляецца абавязковай умовай эфектыўнасці навучання. Практыка арганізацыі навучальнага працэсу ў выкладанні прафесійна арыентаванай лексікі паказала, што пры адборы тэкставага матэрыялу павінны ўлічвацца наступныя крытэрыі: прафесійная накіраванасць, інфармацыйнасць, актуальнасць, моўная даступнасць.

Прафесійна арыентаваны тэкст – гэта складанае цэлае, якое ўключае ў сябе пэўны набор лексічных тэрмінаў, якія адносяцца да пэўнай галіны ведаў, і мае значэнне для будучай кар'еры навучэнца. Прафесійна арыентаваныя тэксты выкарыстоўваюцца ва ўсіх тыпах маўленчай дзейнасці (чытанне, пісьмо, гаварэнне).

Тэксты адыгрываюць важную ролю ў вывучэнні юрыдычнай лексікі, бо яны забяспечваюць кантэкст для разумення і выкарыстання тэрмінаў. Без чытання і аналізу тэкстаў складана ацаніць, як той ці іншы юрыдычны тэрмін выкарыстоўваецца ў рэальным жыцці, якія адценні значэння ён можа мець, як ён узаемадзейнічае з іншымі словамі і фразамі.

Юрыдычны тэкст можа быць вельмі складаным і цяжкім для разумення, асабліва для пачаткоўцаў. Ён часта змяшчае ўнікальныя тэрміны і фразы, якія не ўжываюцца ў звычайным гутарковым маўленні. Вывучэнне такога кшталту тэкстаў дапамагае студэнтам зразумець, як гэтыя тэрміны і фразы выкарыстоўваюцца ў кантэксце, і дае ім магчымасць прымяняць іх на практыцы.

Тэксты з'яўляюцца важнай крыніцай для засваення новых тэрмінаў і паняццяў. Часта студэнты сустракаюцца з новымі тэрмінамі пры чытанні тэкстаў, і гэта, з аднаго боку, дапамагае ім пашырыць свой слоўнікавы запас, а з другога боку, дазваляе зразумець, як тэрміны могуць быць выкарыстаны ў розных кантэкстах, што можа быць карысна пры ўжыванні іх у пісьмовай мове ці ў вусным маўленні.

Акрамя таго, працуючы з прафесійнымі тэкстамі розных жанраў, навучэнцы атрымліваюць магчымасць пазнаёміцца са структурай і фарматам юрыдычных дакументаў. Гэта можа быць карысна не толькі для разумення, як гэтыя дакументы структураваны, але і для таго, каб будучыя спецыялісты маглі самастойна складаць падобныя дакументы.

Традыцыйная методыка работы з тэкстам прадугледжвае некалькі этапаў. На першым этапе адбываецца знаёмства з новымі тэрміналагічнымі адзінкамі. Другі этап прадугледжвае выкарыстанне дадзенай лексікі на аснове прыведзенага тэксту ў якасці ўзору. Трэці этап уключае серыю заданняў з мэтай адпрацоўкі дадзенага матэрыялу.

Пры рабоце з новай прафесійнай лексікай мэтазгодна выкарыстоўваць розныя спосабы і прыёмы семантызацыі слоў, да якіх адносяцца: а) тлумачэнне лексічнага значэння слоў з дапамогай лінгвістычных слоўнікаў; б) падбор сінонімаў і сінанімічных слоў; в) тлумачэнне відавога паняцця праз родавае; г) высвятленне значэння слоў праз кантэкстуальнае ўжыванне, сінтагматычныя сувязі.

На першым этапе для замацавання юрыдычных вызначаных тэрмінаў можна выкарыстоўваць розныя віды заданняў. а) выпісаць з тэксту тэрміналагічныя словы і словазлучэнні і перакласці на рускую мову; б) утварыць словазлучэнні з выпісанымі тэрмінамі; в) падабраць да іх аднакаранёвыя словы і інш.

На другім этапе працы з тэкстам навучэнцы набываюць навыкі і ўменні, якія спрыяюць развіццю камунікатыўнай кампетэнцыі. Пры сістэмнай працы з тэкстам фармуюцца агульныя камунікатыўныя ўменні:

- адэкватна ўспрымаць вуснае і пісьмовае маўленне;
- раскрываць тэму і асноўную думку тэксту;
- збіраць і сістэматызаваць матэрыял;
- пераказваць падрабязна, выбарачна, сціснута зыходны тэкст;
- складаць тэксты розных стыляў маўлення і розных тыпаў;
- рэдагаваць і паляпшаць напісанае;
- правільна арыентавацца ва ўмовах зносін;
- паслядоўна будаваць выказванне ў адпаведнасці з задумай;
- знаходзіць адэкватныя моўныя сродкі для перадачы зместу выказвання;
- выкладаць думкі з дастатковай ступенню паўнаты.

Найбольш эфектыўнымі на гэтым этапе будуць такія віды работы, якія звязаны з аналізам юрыдычнага тэксту: адказ на пытанні па тэксце, абмеркаванне і каменціраванне тэксту з выкарыстаннем вывучанай лексікі, анатаванне, пераказ, дапаўненне тэкстаў дадатковай інфармацыяй і інш.

Сістэма заданняў трэцяга этапу накіравана, у першую чаргу, на развіццё маўлення. Гэты этап з'яўляецца самым складаным, бо вымагае ад навучэнцаў змястоўна, правільна, лагічна і паслядоўна выражаць свае думкі, свабодна выкарыстоўваючы раней назапашаны моўны матэрыял. Пры фарміраванні маўленчых навыкаў важна памятаць пра тое, што студэнт "ніколі не навучыцца выказваць свае думкі, уступаць у суразмоўніцтва, пакуль не будзе пастаўлены пе-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

рад неабходнасцю дзейнічаць (гаварыць) ва ўмовах штучнага маўленчага асяроддзя” [3, с. 138].

Найбольш прыдатнымі для развіцця маўлення з’яўляюцца наступныя заданні: абмеркаванне прафесійных тэм у фармаце круглага стала, штучнае стварэнне маўленчых сітуацый, ролевыя гульні, інтэрв’ю, апытванні і г.д. Разгледжаныя метады і прыёмы не толькі развіваюць маўленне, але і актывізуюць пазнавальную дзейнасць, фарміруюць навыкі лагічнага мыслення навучэнцаў.

Такім чынам, работа з тэкстамі па спецыяльнасці садзейнічае актыўнаму ўключэнню студэнтаў у вучэбна-прафесійную дзейнасць, знаёмству з лексікай, граматыкай мовы, тэрмінамі іх будучай спецыяльнасці. Таму спецыяльна распрацаваныя і прымяняемыя для авалодання мовай тэксты па спецыяльнасці могуць служыць эфектыўным сродкам навучання.

**Спіс выкарыстанай літаратуры**


1. Золотова, Г. А. Грамматика как наука о человеке / Г. А. Золотова // Русский язык в научном освещении. – 2001. – № 1. – С. 107–113.
2. Быстрова, Е. А. Коммуникативная методика в преподавании русского языка / Е. А. Быстрова // Рус. язык в школе. – 1996. – № 1. – С. 35.
3. Яленскі, М. Г. Асобасны падыход у методыцы навучання беларускай мове: тэарэтыка-эксперыментальнае даследаванне / М. Г. Яленскі. – Мінск : НІА, 1997. – 171 с.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова